**УДК 93/94(476):796/799**

# ЯЎРЭЙСКІЯ СПАРТЫЎНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ УСХОДНІХ КРЭСАЎ У СКЛАДЗЕ ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў 1920–1930-Я ГАДЫ

*Ляневіч А. С.*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, Мінск, Беларусь

*У артыкуле разгледжаны яўрэйскія спартыўныя арганізацыі на беларускіх землях, так званых Усходніх Крэсах, якія ўваходзілі ў склад Польскай Рэспублікі ў міжваенны перыяд, іх удзел у агульнапольскіх, нацыянальных і міжнародных спаборніцтвах.*
*Ключавыя словы: спартыўныя таварыствы; яўрэйскія арганізацыі; Усходнія Крэсы; спорт; Польская Рэспубліка.*

# JEWISH SPORTS ASSOCIATIONS ON THE TERRITORY OF THE EASTERN BORDERS IN THE COMPANY OF THE POLISH REPUBLIC IN 1920−1930'S

*Lianevich A.*
National Institute for Higher Education, Minsk, Belarus

*The article examines the topic of Jewish sports organizations in the Belarusian lands, the so-called Uschodnija Kresy, which were part of the Republic of Poland in the interwar period, their participation in national, national and international competitions.*
*Keywords: sports societies; Jewish organizations; Uschodnija Kresy; sports; Polish Republic.*

Пасля падзей першай паловы ХХ ст. і падпісання Рыжскай дамовы паміж Польскай Рэспублікай, РСФСР і УССР у 1921 г. былі вызначаны межы Польшчы. У яе склад увайшлі тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, якія атрымалі назву Усходніх Крэсаў (Kresy Wschodnie). Акрамя тытульнай польскай нацыі, тут пражывалі прадстаўнікі ўкраінскага, яўрэйскага, беларускага, рускага, літоўскага народаў, а на захадзе краіны – нямецкага, нацыянальныя меншасці складалі каля 35 %, у сваю чаргу яўрэяў – 10 % ад агульнай колькасці насельніцтва краіны [14].

Такім чынам, значная іх частка прымала ўдзел ў грамадска-палітычным, культурным і спартыўным жыцці Другой Рэчы Паспалітай 1920–1930-х гг. Спрыяў гэтаму і прыняты праз польскі Сейм 28 красавіка 1919 г. так званы «Трактат нацыянальных меншасцяў»

(Traktat mniejszościowy), згодна з якім абвяшчаліся роўнасць у правах усіх жыхароў і неабмежаваныя магчымасці развіцця ўласнай культуры, веры і мовы [5; 19].

Стварэнне першых яўрэйскіх спартыўных таварыстваў адбывалася яшчэ да Першай сусветнай вайны. Найбольш актыўнае ўцягванне яўрэяў у сферу фізічнай культуры пачалося ў пачатку XX ст., калі лекар, пісьменнік, палітык Макс Нардаў (Max Nordau) у 1898 г. заклікаў надаць большую ўвагу развіццю яўрэйскага спорту як аднаму з асноўных кампанентаў, якія спрыяюць не толькі фізічнаму, але і духоўнаму развіццю і росту нацыянальнай самапавагі. Ім жа была сфармулявана думка аб выхаванні «мускульнага яўрэя»; дадзены аспект выклікаў вялікі рэзананс у грамадстве [12].

Адным з першых таварыстваў, створаных у 1900 г. па закліку М. Нардаў, быў бярлінскі гімнастычны клуб «Бар-Кахба». Па яго прыкладу з 1911 г. пачынае развівацца макабіянскі рух, створаны ў Палестыне, які затым распаўсюдзіўся ў Еўропе праз стварэнне таварыстваў «Макабі».

Першыя спартыўныя арганізацыі пачалі з'яўляцца яшчэ на тэрыторыі Расійскай і Аўстра-Венгерскай імперый. У ліку першых былі створаны кракаўскае, лодзкае і варшаўскае аб'яднанні «Макабі» ў 1909, 1912 і 1915 гг. адпаведна. Годам раней у Львове пачало сваю дзейнасць гімнастычнае таварыства «Дрор» (ŻTGS Dror), укладзенае па прыкладу пражскага «Сокала», і спартыўны клуб «Гасманэя» (ŻKS Hasmonea), што дало штуршок далейшаму распаўсюджванню яўрэйскіх спартыўных таварыстваў у розных гарадах і мястэчках [11; 16].

У сваю чаргу гімнастычны гурток пры пецярбургскім Таварыстве аховы здароўя яўрэяў (Общество здравоохранения евреев) у 1916 г. быў мадэрнізаваны ў спартыўны клуб «Ахдут». Па прыкладу расійскай сталіцы ў красавіку 1917 г. адкрыты спартыўны клуб «Макабі» ў Адэсе, які фактычна стаў штаб-кватэрай цэнтральнага камітэта Усерасійскага саюза яўрэйскіх спартыўных клубаў «Макабі», дзе старшынёй быў Якаў Граноўскі. Да 1917 г. на тэрыторыі імперыі дзейнічала каля 125 макабіянскіх гурткоў, у тым ліку ў Мінску, Віцебску, Гомелі, Рэчыцы і інш. Спрыяла гэтаму дзейнасць сіяністкай студэнцкай арганізацыі «Хе-Хавер», асабліва пасля правядзення VI з'езда, які адбыўся ў Петраградзе ў красавіку 1917 г., дзе было агучана аб неабходнасці стварэння па ўсёй краіне сеткі яўрэйскіх спартыўных клубаў «Макабі». Сама арганізацыя пасля аб'яднання ў сакавіку 1924 г. з Таварыствам

сіяніцкіх студэнтаў Украіны і беларускім «Кадыма» атрымала назву «Адзінае ўсерасійскае таварыства сіяніцкай моладзі», якое актыўна ўзаемадзейнічала з макабянскім рухам [1].

Асноўным відам спартыўных заняткаў, якія практыкавалі ў большасці аб'яднанняў, была гімнастыка. Дадзеная акалічнасці была абумоўлена вялікай роляй, якую надавалі ў грамадстве менавіта фізічнаму выхаванню на аснове гімнастычных практыкаванняў. Акрамя таго, прыкладам для стварэння яўрэйскіх таварыстваў стала актыўнае развіццё і распаўсюджванне чэшскага, а затым і агульнаславянскага «Сокала», дзе таксама ў асноўным практыкавалася культура цела праз разнастайныя заняткі: скокі, бег, працу з гантэлямі і гірамі і інш. Звычайна яны праводзіліся ў памяшканнях, альбо на адкрытых пляцоўках, ці пры выездах на прыроду, якія ладзілі звычайна летам.

Між іншым грамадска-палітычныя і ваенныя падзеі першай паловы XX ст. безумоўна паўплывалі на далейшае развіццё яўрэйскага руху. На тэрыторыі, якая была ўключана ў склад Савецкай дзяржавы, спартыўныя таварыствы сутыкнуліся з ідэалагічным і адміністрацыйным ціскам з боку ўлады. У канцы 1920-х гг. іх актыўная дзейнасць фактычна спынілася, а ў 30-я гг. зусім знікла. Дзяржаўная палітыка была засяроджана на пабудове грамадства на сацыялістычных прынцыпах, выхаванага на ідэях пралетарскай дыктатуры і класавасці, што замацоўвалася ў Канстытуцыі СССР, дзе адзначалася, што грамадства складаецца з двух дружалюбных адзін аднаму класаў, з рабочых і сялян, у аснове ўлады стаіць менавіта працоўны клас, а дзяржаўнае кіраўніцтва грамадствам належыць рабочаму класу як перадавому класу грамадства [3]. Гэта датычылася і спартыўных аб'яднанняў, якія пачалі ствараецца на платформе працоўных калектываў, навучальных устаноў, вайсковых частак і т. п. Такім чынам, вузканацыянальныя таварыствы станавіліся не адпавядаючымі агульнасаюзнай сістэме фізічнага выхавання.

Беручы пад увагу тую акалічнасць, што большасць яэрэйскіх клубаў падтрымлівала цесныя сувязі з нацыянальна-арыентаваным сіяніцкім рухам, яны фактычна станавіліся варожымі для савецкай класавай сістэмы. У 20-я гг. разгарнулася кампанія па барацьбе з сіяніцкім уплывам, у тым ліку сярод маладзёжных арганізацый, да якіх адносіліся як культурніцкія, так і спартыўныя, якія практычна былі ліквідаваны ўжо да пачатку 1930-х гг. [2; 4].

У той жа час на землях, што ўвайшлі ў склад Польскай Рэспублікі, шэраг яўрэйскіх таварыстваў, якія існавалі да 1921 г., не толькі

працягвалі сваё існаванне, але і ствараліся новыя клубы ў Гродна, Баранавічах, Пінску, Лунінцы, Беластоку і інш. Разам з тым сваю працу аднавіў створаны яшчэ ў 1918 г. Цэнтральны Саюз яўрэйскіх спартыўна-гімнастычных таварystваў (Centralny Związek Żydowskich Towarzystw Gimnastyczno-Sportowych), які пасля пераводу штаб-кватэры ў Варшаву артымаў назву «Яўрэйскай Рады фізічнага выхавання Польскай Рэспублікі» (Żydowska Rada Wychowania Fizycznego Rzeczypospolitej Polskiej). Структура мусіла каардынаваць дзейнасць яўрэйскага спорту на ўсёй тэрыторыі Польшчы, якая была падзелена на акругі і аб'ядноўвала найбольш буйныя гарады з актыўнымі спартыўнымі асяродкамі.

У сваю чаргу органамі, што рэгулявалі міжнацыянальныя адносіны ў Другой Рэчы Паспалітай, развіццё спорту і фізічнай культуры, займаліся Міністэрства па пытаннях рэлігіі і народнай асветы (Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego), а таксама Дзяржаўная Рада фізічнага выхавання і фізічнай культуры (Rada Wychowania Fizycznego i Kultury Cielesnej) [6; 13; 15].

Безумоўна, вядучую ролю ў распаўсюджванні здаровага ладу жыцця сярод яўрэйскага насельніцтва на польскіх землях, у тым ліку Усходніх Крэсаў, гралі таварыствы «Макабі». Асабліва гэта было адзначана на XII Сусветным сіяніцкім кангрэсе ў чэшскіх Карлавых Варах, дзе Асамблея яўрэйскіх спартыўных асацыяцый змяніла сваю назву на Сусветны саюз Макабі. Згодна з прынятым Статутам, мэтай арганізацыі з'яўлялася фізічнае і маральнае выхаванне яўрэяў для адраджэння, захавання і абароны яўрэйскай зямлі. Таксама была прынята праграма, скіраваная ў першую чаргу на маладое пакаленне. У праграме акрамя вывучэння іўрыта і гісторыі была адзначана неабходнасць развіцця спорту і фізічнай культуры [10].

Як адзначалася вышэй, макабіянскія клубы з'явіліся на разглядаемай тэрыторыі яшчэ ў першай палове XX ст., і ў польскай дзяржаве яны ізноў аднавілі сваю дзейнасць. Да іх можна аднесці віленскае гімнастычна-спартыўнае таварыства «Макабі», створанае яшчэ ў 1916 г., дзе акрамя футбольнай каманды функцыянавалі легкаатлетычная, веласіпедная, лыжная, шахматная і вяслярская секцыі. Апошняя, між іншым, мела ўласную прыстань і месціла каля 50 чоўнаў, з'яўляючыся адной з буйнейшых у Вільні. Але вядучым аддзелам была футбольная каманда, якая прымала ўдзел у нацыянальных спаборніцтвах па футболе, выступаючы ў класе А Віленскага акруговага футбольнага

саюза, і складала галоўную канкурэнцыю вядучай гарадской камандзе вайскоўцаў «Сміглы» (WKS «Śmigły» Wilno). Стаўшы чэмпіёнам акругі ў 1938 г., «макабіянцы» прынялі ўдзел у праве выхаду ў вышэйшы дывізіён краіны, але саступілі канкурэнтам з Луцка, Гродна і Брэста [7]. Больш значным поспехам адзначыліся віленскія атлеты – у штурханні ядра Соня Левін-Шмуклер (Sonia Levin-Schmuckler) стала чэмпіёнкай Польшчы, а ўсталяваны ёй рэкорд не быў пабіты наступныя 25 год. Таварыствам арганізоўваліся перыядычныя гімнастычныя курсы для інструктараў, на якія прыязджалі прадстаўнікі з Свянцян, Глыбокага, Ліды і інш.

У рэгіянальных лігах і гарадскіх першынствах выступалі іх аднаклубнікі з Гродна, Беластока, Пінска, Ліды, Брэста і іншых гарадоў і мястэчак. Больш значных поспехаў на агульнапольскай арэне змаглі дасягнуць прадстаўнікі Львова, дзе з 1908 г. існавала адна з буйнейшых каманд ва Усходнім рэгіёне – «Гасманэя» (Żydowski Klub Sportowy «Hasmonea» Lwów). Добрая матэрыяльная база забяспечвалася не толькі за кошт клубных узнёскаў, але і яўрэйскай грамады Львова, што дазволіла клубу пабудаваць уласны стадыён, які змяшчаў да 10 000 гледачоў, і даволі паспяхова развіваць секцыі настольнага і вялікага тэніса, бокса, лыжнага спорту, веласпорту, легкаатлетычную, плаванне, мотаспорту, хакея [16; 8].

Маючы неблагую матэрыяльную базу і адміністрацыйны рэсурс, «хашманаім» (прозвішча ігракоў «Гасманэі») удала канкурыравалі з іншымі камандамі горада – «Лехія» (LKS «Lechia» Lwów), «Чарні» (I. Lwowski Klub Sportowy «Czarni») і флагманам польскага футбола «Пагоняй» (LKS «Pogon» Lwów), а таксама клубамі Кракава, Варшавы і інш. У 1927, 1928 гг. футбалісты прынялі ўдзел у вышэйшым дывізіёне чэмпіяната Польшчы, дзе занялі 11-е і 13-е месцы адпаведна, стаўшы з кракаўскай «Ютшэнкай» (ŻTS «Jutrzenka» Kraków) адзінымі прадстаўнікамі сярод яўрэйскіх футбольных таварыстваў, якія дасягнулі падобнага ўзроўню. Акрамя таго, хакейная дружына станавілася неаднаразовым пераможцам львоўскай акругі, баксёры Рубін Карсовер (Rubin Korsower), Маркус Шырак (Markus Schirak) з’яўляліся лепшымі ў Львове, а Філіп Страўс (Filip Strauss) меў тытул віцэ-чэмпіёна Польшчы [16].

Прымалі ўдзел яўрэйскія спартсмены і ў асобных турнірах, арганізаваных як папулярнымі спартыўнымі штотыднёвікамі таго часу (Кубак газеты «Przegląd Sportowy», ці штогадовыя спаборніцтвы на

ўзнагароды выдання «Dziennik Nowy»), так і таварыствамі-юбілярамі. Напрыклад, з нагоды 12-годдзя беластоцкага Яўрэйскага спартыўнага клуба быў праведзены матч з аднаклубнікамі з Вільні. Гэтак жа і на 10-годдзе віленцаў былі запрошаны футбалісты з іншых каманд. Таксама арганізоўваліся асобныя пяршынствы: з верасня 1927 г. у Кракаве ладзіліся Агульнапольскія спаборніцтвы яўрэйскіх клубаў (Ogólnopolskie Zawody Klubów Żydowskich), у якіх прымалі ўдзел атлеты львоўскай «Гасманэі», «Дрора», «Ютшэнкі», кракаўскага і варшаўскага «Макабі» і інш. [8; 17].

Акрамя таго, большасць яўрэйскіх каманд падтрымлівала цесныя сувязі з еўрапейскімі прадстаўнікамі і на працягу міжваеннага перыяду перыядычна арганізоўвала таварысцкія сустрэчы з замежнымі камандамі ў Польшчы, ладзіла выязныя матчы. Варта адзначыць, што прыезд клубаў з-за мяжы выклікаў вялікі рэзананс і цікавасць тагачасных гледачоў. У 1924 г. у Вільню з Вены прыехаў віцэ-чэмпіён Аўстрыі каманда «Хакоах» (SC «Hakoah» Wien). Па сведчаннях, гасцей на вакзал прыйшлі сустракаць сотні чалавек і аркестр, а падчас гульні трыбуны былі цалкам запоўнены. Падобная сітуацыя была і ў Гродна з прыездам літоўскай каманды L.G.S.F. з Каўнаса, а таксама адной з мацнейшых каманд Венгрыі «Кішпешт» (Kispesti AC) з Будапешта [7].

Немалаважнай акалічнасцю ў развіцці яўрэйскага спорту ва Усходніх Крэсах было ўключэнне мясцовых таварыстваў у міжнароднае спаборніцтва «Макабіяда», у якой прымалі ўдзел яўрэйскія атлеты з усяго свету. Першае з іх прайшло ў Тэль-Авіве ў 1932 г., дзе дэлегацыя Польшчы заняла першае месца, заваяваўшы 8 залатых медалёў. На другім, у 1935 г., яна стала пятай. Сярод удзельнікаў двухразовым віцэ-чэмпіёнам гульняў была прадстаўніца Вільні Соня Левін. Не менш паспяховымі былі і Зімовыя Макабіяды, якія пачалі праводзіцца з 1935 г. Першыя праходзілі ў Закапанэ, а другія ў 1936 г. у чэскай Баньска Быстрыцы. Акрамя турніру, Сусветным саюзам «Макабі» ладзіліся зборы, на якіх у тым ліку былі прадстаўнікі Львова, Перамышля, Вільні і іншых гарадоў [18; 9].

Між іншым некаторыя яўрэйскія спартсмены займелі права выступаць за нацыянальныя каманды Польшчы. Сярод іх баксёр Шапса Ротальц (Szapsa Rotholc), шахматыст Акіба Рубінштэйн (Akiba Rubinstain), плывец Ілія Шрайбман (Ilia Szrajbman), тэнісіст Эрнэст Вітман (Ernest Wittmann), аўтар першага забітага мяча за футбольную зборную Юзэф Клоц (Józef Klotz), а таксама галкіпер хакейнай збор-

най, алімпійскі чэмпіён, ураджэнец Пінска Тадэуш Сахс (Tadeusz Sachs) і інш. Падобная актыўнасць і станоўчыя вынікі спрыялі папулярызацыі здаровага ладу жыцця і спорту ўвогуле сярод яўрэяў, робячы з яго самы арганізаваны і буйны спартыўны рух сярод нацыянальных меншасцяў Польскай Рэспублікі. У 1937 г. колькасць макабіянскіх таварыстваў склала каля 250 арганізацый і каля 45 000 членаў па ўсёй краіне, яшчэ каля 5000 з'яўляліся сябрамі іншых яўрэйскіх клубаў («Гасманэі», «Ютшэнкі», «Хапаэля» і інш.).

Такім чынам, распачаты ў першай палове ХХ ст. накірунак на стварэнне і распаўсюджванне арганізацый, якія выхоўвалі культуру цела сярод яўрэйскага насельніцтва, займеў свой працяг не толькі ў заходнееўрапейскіх дзяржавах, але і ў Польшчы, у тым ліку на землях Заходняй Беларусі і Украіны. Некаторыя з іх былі створаны ў перыяд Расійскай і Аўстра-Венгерскай імперый, але пасля 1921 г. таварыствы, што апынуліся на тэрыторыі Савецкага Саюза, былі цягам дзесяцігоддзя фактычна ліквідаваны. У сваю чаргу ў Другой Рэчы Паспалітай многія з іх не толькі працягвалі існаваць, але і за кошт удзелу ў агульнанацыянальных і міжнародных спаборніцтвах зрабілі свой унёсак у развіццё рэгіянальнага і польскага спорту.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. *Базаревич, А.* Организация сионистской работы среди еврейской молодёжи Беларуси в конце 1910-х и в 1920-е годы / А. Базаревич // Беларусь у XIX–XXI стагоддзях: этнакультурнае і нацыянальна-дзяржаўнае развіццё: зб. навук. арт. / рэдкал.: В. А. Міхедзька (адк. рэд.) [і інш.]; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гом. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2015. – С. 86–92.

2. *Даніловіч, В. В.* Яўрэйскія маладзёжныя арганізацыі Савецкай Беларусі / В. В. Даніловіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі / С. А. Усанаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Выдавец. дом «Беларуская навука», 2015. – № 2. – С. 54–62.

3. *Кузнецов, Д. В.* Советские Конституции. Хрестоматия: в 4 ч. / Д. В. Кузнецов. – Благовещенск: Благовещ. гос. пед. ун-т, 2015. – Ч. 2: СССР, 1922–1936 гг. – С. 9–33.

4. *Симонова, А.* Сионистское движение в Советской России в 20-е годы / А. Симонова // Российский сионизм: история и культура: материалы науч. конф., 22–23 окт. 2001 г. / редкол.: О. Будницкий [и др.]. – М.: Дом еврей. кн., 2002. – С. 278–287.

5. *Balcerak, W.* Mniejszości – rewizjonizm / W. Balcerak // Mazowieckie Studia Humanistyczne / red. A. Koryn. – Łowicz: 2008. – № 1–2. – С. 75–91.

6. Dekret o utworzeniu Ministerstw: Spraw Zewnętrznych, Spraw Wojskowych, komunikacji i aprowizacji: [o utworzeniu Ministerstw] // Monitor Polski. – 1918. – 2 list. – S. 1.

7. *Gowarzewski, A.* Kolekcja klubów / A. Gowarzewski. – Katowice: GiA, 1997. – T. 4: Lwów i Wilno w ekstraklasie. Dzieje polskiego futbolu kresowego. – S. 182–190.

8. *Górko, J.* Piłkarskie dzieje Podlasia: 80 lat historii piłki nożnej w regionie podlaskim: 1929–2009 / J. Górko. – Wysokie Mazowickie: Sendsport, 2010. – S. 10–30.

9. *Kozłowski, M.* Naród Wybrany – Cracovia Pany. Z wielokulturowej historii polskiego sportu / M. Kozłowski. – Kraków: Drukarnia Poligraf, 2015. – S. 41–45.

10. *Kowieska, U.* Działalność żydowskich klubów sportowych w II Rzeczypospolitej / U. Kowieska // Wychowanie fiziczne i sport / red.: K. Mazurek. – Warszawa: Wydawnictwo AWF. – 1991. – № 1–2. – S. 87–93.

11. *Luberda, M.* Machabeusze Sportu Sport żydowski w Krakowie / M. Luberda, P. Figiela [i inni]. – Kraków: Belda M, 2012. – S. 69–194.

12. *Nordau, M.* Zionistische Schriften. Hrgs. vom Zionistischen Aktionskomitee / M. Nordau. – Köln: Jüdischer Verlag, 1909. – S. 380–381.

13. O utworzeniu Rady Naczelnej Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego oraz Wojewódzkich i Powiatowych Komitetów Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego: Rosporządzenie Rady Ministrów z dnia 25 kwietnia 1925 r. // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1925. – № 45. – S. 633–635.

14. Polski wiek XX. Tom I / red.: K. Persak [I in.]. – Warszawa: Bellona. – 2009. – S. 51–232.

15. Przysposobienie Wojskowe / Komitet W. F. i P. W.; red. F. Waluszewski. – Przemyśl: Drukarnia Jana Łazora, 1928. – S. 5–10.

16. *Steisel, A.* ŻKS Hasmonea Lwów 1908–1933 / A. Steisel. – Lwów: Sztuka, 1933. – S. 3–47.

17. Sport. X-cio lecie Ż.T.G.S. Makkabi: [o sporcie] // Słowo. – 1926. – № 246. – S. 4.

18. *Szuchta, R.* 1000 lat historii Żydów polskich. Podróż przez wiek / R. Szuchta. – Bydgoszcz: Drukarnia Multigraf, 2015. – S. 184–186.

19. *Wojtycza, J.* Państwowy Urząd Wychowania Fizycznego i Przysposobienia Wojskowego jako element koordynacji system bezpieczeństwa w II RP w latach 1927–1939 / J. Wojtycza // Bespeczenstwo. Teoria i praktyka / red. K. Budzowski. – Kraków, 2012. – № 2 (VII). – S. 81.

**(Дата паступлення: 25.04.2021).**